

# *Этнаграфічны пакой*

# *«Быт сялянскага памежжа»*

У музейным пакоі прадстаўлены 90 этнаграфічных экспанатаў. Сярод іх: кросны, ложак, маслабойка, збаны, разнастайныя прасы, падвесная калыска, ручнікі, кашуля, драўляны плуг і многія іншыя прадметы хатняга ўжытку канца 19-пачатку 20 стагоддзяў. Гэтыя экспанаты зробленыя з разнастайных матэрыялаў: дрэва, шкла, жалеза, гліны, лазы. Усе яны ўяўляюць сабой велізарную гістарычную каштоўнасць, таму што адлюстроўваюць асаблівасці культуры сапоцкінскай зямлі. Разнастайныя прадметы хатняга побыту, посуд, дапаможны інвентар, мэбля, адзенне займаюць у сістэме інтэр'еру сваё месца, размешчаны ў пэўнай паслядоўнасці і парадку, ствараючы функцыянальную і кампазіцыйную ўзаемасувязь. Інтэр'ер стварае асаблівы мікраклімат, стан душы і сведчыць не толькі аб матэрыяльным, але і духоўных баках жыцця, характэрную кожнаму народу культурную сераду, народныя звычаі і вераванні, дазваляе максімальна наблізіцца да культуры рэгіёну мінулых стагоддзяў.

Запрашаем наведацца ў музейны пакой!



# *Кашуля*

*Традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складалі доўгая, амаль да каленяў, кашуля і штаны з даматканага палатна натуральнага (белага) колеру. Кашуля мела некаторыя лакальныя асаблівасці ў кроі, форме каўняра і рукавоў, яе насілі навыпуск паверх штаноў, пад пояс. Кашуля (сарочка) – самы старажытны і ўстойлівы элемент у традыцыйным народным касцюме. У найбольш старажытным варыянце яна мела тунікападобны крой, доўгія, нярэдка ніжэй кісці, рукавы і прамы разрэз вората.*

*Ва усіх усходнеславянскіх народаў кашуля была вядома ў якасці адзінага летняга адзення: яе насілі падлеткі аж да самай жаніцьбы. Аздаблялі кашулю найчасцей вышываным арнаментам, ужываючы ніці сіняга, чырвонага і зялёнага колеру. Гата кашуля – прыклад тых, якія найчасцей былі распаўсюджаны на сапоцкінскай зямлі.*



# *Посуд*

*Гаршкі, збаны – гэта абавязковыя рэчы сялянскай хаты, сялянскага побыту. Збаны найчасцей выраблялі з гліны, якая распаўсюджана ў мясцовасці. Адзін з гэтых збаноў зроблены з чырвонай гліны і з'яўляецца цэнным экспанатам. Іх выкарыстоўвалі для захавання малака, налівалі воду. Гаршкі бывалі розных памераў, ад самых малых да вялікіх. У іх гатавалі ежу на пячы. Гэтыя збаны і гаршкі сабраны з тэрыторыі сапоцкінскі х зямель, яшчэ нядаўна імі карысталіся мясцовыя жыхары. Усё радзей і радзей такі посуд можна сустрэць у сельскай мясцовасці.*



# Каляска

*Ці можна сёння яшчэ дзе – небудзь убачыць такую каляску? Гэта каляска няпростая – яна ўдзельнічала пры здымках фільма ў вёсцы Асочнікі.  Менавіта ў ёй адна з гераінь фільма калыхала сваё дзіця.*

*Гэта каляска не мае сабе аналагаў. Яна зплецена з лазовых прутоў, на чатырох драўляных колах. У перадзе знаходзіцца драўляная разная ручка. У школьны этнаграфічны музей яна папала ад жыхаркі вёскі Чарток.*



# Кашы

Ці можна ўявіць сабе жыццё селяніна без гэтых дзіўных рэчаў, так неабходных у гаспадарцы? Сапраўды, нельга.

Кашы – гэта пляцёная ёмістасць розных памераў для захоўвання і транспарціроўкі сыпкіх і штучных рэчываў, пераважна харчовых прадуктаў. У Сапоцкіне найбольш пашыраны былі кашы паўкруглай формы, плеценыя з лазовых прутоў. З той жа мэтай выкарыстоўваліся кашы з плоскім дном. Для такіх кашоў выраблялі яшчэ і крышкі, каб прыкрываць тое, што знаходзілася ў іх.

Мясцовыя жыхары карыстаюцца такімі кашамі да гэтай пары. Асабліва дапамагаюць яны селяніну ў час капання бульбы. Усё часцей і часцей лазу, з якой выраблялі кашы, замяняя дрот. У Сапоцкіне ёсць майстар, які вырабляе гэтыя рэчы.



# *Драўляны плуг*

*Гэта дзіўная рэч знаходзіцца ў школьным краязнаўчым музеі. Ёй ужо многа гадоў, але ж ніхто не можа сказаць, колькі. Адно вядома, што такімі плугамі ўжо даўно не карыстаюцца. На змену ім прыйшлі моцныя, выраблены з жалеза. Але ж яшчэ сто гадоўў таму не кожны селянін меў такую роскаш. Гэты плуг выраблены з дрэва, а каб больш гадоў ён служыў у гаспадарцы, яму дадалі жалезны наканечнік.*

*На зямлі стаіць плужок*
*Селяніну ён дружок.*
*Усё жыццё сваё працуе,*
*Землю пад пасеў рыхтуе.*

*Каб лягчэй было араць –*
*Трэба сілы яму дадаць.*
*Наканечнік у ім жалезны,*
*Будзе вельмі ён палезны.*



# *Рушнікі*

*Рушнікі на працягу стагоддзяў ужываліся для штодзённага і святочнага дэкаратыўнага ўбрання жылля і абразоў, былі адным з неабходных абрадавых атрыбутаў. Іх аздаблялі разнастайным узорыстым натыканнем, вышыўкай, упрыгожвалі зубчастымі карункамі, арнаментам. Мастацкае афармленне рушнікоў мае шмат агульнага з арнаментам народнага беларускага касцюма. У ім пераважаюць геаметрычныя матывы, бытуюць выяўленчыя раслінна –геаметрызаваныя ўзоры.*



## *Матавіла*

*Матавіла – гэта прылада для змотвання і размотвання маткоў пражы. Матавіла, якое ўяўляла сабой невялікі драўляны стрыжань, з'яўляецца найбольш пашыраным. Гэта матавіла складаецца з брусковага крыжа з планкамі на канцах і насаджанай на стрыжань ручкай. Затым яго мацавалі на стойках.*



## *Калыска*

*Зплецена з лазовых дубцоў у выглядзе доўгага кошыка. У хатах калыскі падвешваліся на чатырох почапках да столі ці бэлкі, часцей – да жэрдкі, якая адным канцом затыкалася за бэльку. Такую калыску было зручна браць у поле, дзе яе падвешвалі на прынозе. Плеценыя з лазы калыскі дэкарыравалі спалучэннем розных спосабаў пляцення.*



## Кросны

*Гэта ткацкі стан для ткання ў хатніх ўмовах. Найбольш важныя часткі і прыстасаванні гэта: ставы, на якіх мацаваліся навоі, ніты, берда з набіліцамі, панажы.*

*Найчасцей іх ставілі ля кутняй сцяны ці бліжэй да парога, паміж покуццю і “бабіным кутом”. Наладка кросен і тканне лічыліся жаночай справай. На кроснах выраблялі разнастайныя тканіны, ўзорыстыя ручнікі, абрусы, посцілкі.*



## *Абрус*

*Абрус заўсёды быў абавязковым атрыбутам традыцыйнай сямейнай і каляндарнай абраднасці. Гэты абрус выраблены ў 1913 годзе. Упрыгожаны з чатырох бакоў махрамі. Пераважаюць раслінныя матывы. Выканаць ў чырвона – зялёным колеры.*